ISSN 3072-3140, eISSN 3072-4376
Copyright © by Anastasiya Dzeshkouskaya, 2025
Creative Commons Attribution-NonComercial 4.0
(CC BY-NC 4.0)
https://creativecommons.org/licenses/by-nc/4.0/
DOI: https://doi.org/10.31338/uw.ijbg.2025.4

Анастасія Дзешкоўская ♦ Anastasiya Dzeshkouskaya

Акадэмія паглыбленых даследаванняў Паўночнай Караліны, ЗША
North Carolina Academy for Advanced Studies, USA
ORCID: https://orcid.org/0009-0004-7034-4084
e-mail: r.anastasija123@gmail.com

Выкладанне беларускай мовы як замежнай дзецям беларускай дыяспары: метадычныя выклікі і шляхі іх пераадолення

Teaching Belarusian as a Foreign Language to Children of the Belarusian Diaspora: Methodological Challenges and Ways to Overcome Them

Abstract: The article analyzes the specific features of teaching Belarusian as a foreign language to school-age children in the Belarusian diaspora in the United States. It focuses on teaching approaches that support effective language acquisition with limited exposure to the language. The topic is particularly relevant given the growing number of children learning Belarusian as a foreign language and the lack of textbooks that meet their linguistic, developmental, and psychological needs. Drawing on teaching experience in the "Likhtaryk" club in the United States, the article identifies the main groups of learners according to their language proficiency and outlines the challenges faced by teachers. The study highlights the need to develop specialised teaching and learning materials for children who are not native speakers of Belarusian. The main principles for developing such materials include prioritising communicative practice, presenting content in modules, using visual aids and game-based activities, and adapting materials to the children's cultural contexts and linguistic backgrounds.

Keywords: Belarusian as a foreign language, Belarusian diaspora, teaching children, teaching and learning materials, communicative practice.

Рэзюмэ: Артыкул прысвечаны аналізу асаблівасцяў выкладання беларускай мовы як замежнай дзецям школьнага ўзросту ў беларускай дыяспары ў ЗША. Прадметам даследавання з'яўляюцца метадычныя падыходы, якія забяспечваюць эфектыўнае авалоданне мовай ва ўмовах абмежаванага кантакту з ёй. Актуальнасць абумоўлена павелічэннем колькасці дзяцей, якія вывучаюць беларускую мову як замежную, і недахопам падручнікаў, якія б адпавядалі іх моўным, узроставым і псіхалагічным патрэбам. У артыкуле прааналізаваны рэальны вопыт выкладання беларускай мовы ў ЗША (на прыкладзе гуртка *Ліхтарык*), вылучаюцца асноўныя групы вучняў паводле ступені валодання мовай і акрэсліваюцца метадычныя выклікі, з якімі сутыкаюцца выкладчыкі. У выніку выяўлена неабходнасць стварэння спецыялізаваных вучэбна-метадычных матэрыялаў для дзяцей-іншафонаў. Асноўныя прынцыпы распрацоўкі такіх дапаможнікаў: прыярытэт камунікатыўнай практыкі, модульнасць падачы матэрыялу, візуальная і гульнявая падтрымка, адаптацыя кантэнту да культурных рэалій і моўнага досведу дзяцей.

Паўзроўневы вучэбны комплекс па беларускай мове…

Ключавыя словы: беларуская мова як замежная, беларуская дыяспара, выкладанне дзецям, вучэбна-метадычныя дапаможнікі, камунікатыўная практыка.

У апошнія дзесяцігоддзі назіраецца прыкметнае пашырэнне беларускай дыяспары ў свеце, а таксама яе значная моўная разнастайнасць, што абумоўлівае змены ў характары функцыянавання беларускай мовы па-за межамі Беларусі. Дзеці беларусаў, якія нарадзіліся ў краінах эміграцыі або пакінулі Беларусь у раннім дзяцінстве, апынаюцца ў сітуацыі істотна абмежаванага паўсядзённага кантакту з беларускай мовай. Моўнае асяроддзе малодшага пакалення дыяспары найчасцей фарміруецца не беларускай, а дамінантнай мовай краіны пражывання (англійскай, польскай, нямецкай, літоўскай і інш.). Унутры сям'і характар моўных адносін вызначаецца індывідуальнай моўнай гісторыяй і камунікатыўнымі традыцыямі бацькоў: у адных выпадках дзеці выхоўваюцца ў адносна стабільным беларускамоўным мікраасяроддзі, у іншых – у поўнай адсутнасці рэгулярных кантактаў з беларускай мовай. У выніку статус беларускай мовы для прадстаўнікоў малодшай генерацыі дыяспары становіцца шматварыянтным і можа рэалізоўвацца ў трох асноўных формах: беларуская мова як родная – выкарыстоўваецца ў сямейных зносінах; беларуская мова як спадчынная – прысутнічае ў абмежаваным аб'ёме і патрабуе мэтанакіраванай падтрымкі; беларуская мова як замежная – яе засваенне распачынаецца толькі ў рамках арганізаваных адукацыйных ініцыятыў. Такая сітуацыя вызначае неабходнасць распрацоўкі спецыфічных метадычных падыходаў і адаптаваных адукацыйных матэрыялаў, якія адэкватна ўлічваюць асаблівасці моўнага досведу дзяцей беларускай дыяспары.

Трэба адзначыць, што ў апошнія гады ў свеце (у прыватнасці ў ЗША, Канадзе і Еўропе) узрастае колькасць дзяцей, якія вывучаюць беларускую мову як замежную. У ЗША ў штаце Паўночная Караліна з 2021 года дзейнічае беларускамоўны гурток *Ліхтарык*, у якім выкладанне беларускай мовы вядзецца па некалькіх напрамках. Дзяцей, якія наведваюць анлайн-заняткі ў гуртку, у залежнасці ад ступені валодання беларускай мовай можна падзяліць на тры групы:

1. Вучні школьнага ўзросту (5–13 гадоў), якія валодаюць беларускай мовай як роднай. Гэта дзеці, якія ад нараджэння гадуюцца ў беларускамоўных сем'ях выключна на беларускай мове. Яны засвойваюць родную мову ў натуральным хатнім асяроддзі, часта з нараджэння або ранняга дзяцінства, а не праз фармальнае навучанне ў школе. Паступова яны знаёмяцца з мовай асяроддзя (англійскай мовай у ЗША і французскай мовай у Канадзе), калі пачынаюць наведваць дзіцячы садок ці школу, аднак беларуская мова застаецца першай і роднай. Актыўны лексічны запас у такіх збалансаваных білінгваў вельмі вялікі, нягледзячы на пэўныя абмежаванні з прычыны адсутнасці шырокага беларускамоўнага асяроддзя. Узровень валодання граматыкай таксама можна ахарактарызаваць як блізкі да ўзроўню носьбітаў роднай мовы ў Беларусі. Таму дзеля падтрымкі камунікатыўных кампетэнцый для такіх дзетак можна выкарыстоўваць падручнікі, выдадзеныя для беларускіх школ (з пэўнай адаптацыяй), а таксама дадатковыя практычныя матэрыялы, распрацаваныя выкладчыкамі беларускай мовы за мяжой. Асноўная праца з вучнямі гэтай групы вядзецца ў напрамку пашырэння лексічнага запасу і развіцця маўлення, засваення граматыкі падчас камунікатыўнай практыкі. Такім чынам, выкладанне мовы ў гэтай групе адбываецца па мадэлі **беларуская мова як родная**.

2. Дзеці ўзросту 6–15 гадоў, якія нарадзіліся ў ЗША ў сем'ях эмігрантаў з Беларусі, асноўнымі хатнімі мовамі якіх з'яўляюцца руская і англійская. Такія дзеці атрымліваюць сістэмны кантакт з беларускай мовай толькі падчас штотыднёвых заняткаў, а таксама эпізадычныя

кантакты падчас удзелу ў культурных мерапрыемствах, сустрэчах мясцовых беларускіх суполак, імпрэз, прысвечаных беларускім святам, і г. д. Звычайна такія вучні дэманструюць пачатковы ўзровень авалодання мовай (прыкладна A1–A2). Нягледзячы на абмежаваную колькасць актыўнай лексікі, пасіўны лексічны запас у такіх дзяцей даволі багаты.

Вучні гэтай групы звычайна не маюць праблем з засваеннем лексікі і граматыкі беларускай мовы, дзякуючы, па-першае, выхаванню ў сем'ях, дзе дарослыя знаёмяць дзяцей з роднай мовай і культурай праз казкі, песні, мультфільмы на беларускай мове, а па-другое, з прычыны валодання рускай мовай, якая выступае як мова-пасрэднік. Дзеці названай групы ўжо знаёмыя з марфалагічнай сістэмай усходнеславянскіх моў: маюць уяўленне пра склонавую сістэму, з лёгкасцю авалодваюць правіламі ўжывання канчаткаў скланяльных і спрагальных часцін мовы. Граматычныя формы натуральным чынам засвойваюцца падчас камунікатыўнай практыкі. Такім чынам, выкладанне мовы ў гэтай групе адбываецца па мадэлі **беларуская мова як спадчынная**.

3. Дзеці ўзросту 5–11 гадоў, якія нарадзіліся і выхоўваюцца ў англамоўным асяроддзі ў ЗША, у франкамоўным асяроддзі ў Канадзе і ў нямецкамоўным асяроддзі ў Германіі. Нават пры наяўнасці беларускага паходжання аднаго з бацькоў яны пачынаюць вывучаць беларускую мову з нуля, бо не маюць натуральнага беларускамоўнага асяроддзя ў сям'і. Заняткі ў невялікіх гуртках ці з прыватнымі настаўнікамі, якія адбываюцца адзін раз на тыдзень, фактычна з'яўляюцца для такіх дзяцей-іншафонаў адзінай крыніцай сістэматычнага кантакту з беларускай мовай. Падчас працы з гэтай групай выкарыстоўваецца мадэль беларуская мова як замежная.

Асноўныя цяжкасці падчас працы ў беларускамоўным гуртку *Ліхтарык* у ЗША звязаныя менавіта з дыдактычнымі асаблівасцямі выкладання беларускай мовы як замежнай вучням, асноўнымі мовамі якіх з'яўляюцца англійская, французская і нямецкая. Падчас працы з англамоўнымі і рускамоўнымі дзецьмі выкладчык выкарыстоўвае родную мову вучняў мэтанакіравана і ў неабходнай ступені. Даследчыкі адзначаюць эфектыўнасць абмежаванага і матываванага выкарыстання роднай мовы як педагагічнага сродку падтрымкі засваення замежнай мовы: "Use of the Language 1 to illustrate cross-linguistic comparisons or to provide the meaning of abstract vocabulary items can mediate Language 2 development during ZPD activity in the target language" [Swain, Lapkin 2013: 123].

У працэсе працы з франкамоўнымі вучнямі з Канады і нямецкамоўнымі вучнямі з Германіі выкарыстанне імерсіўнага метаду з'яўляецца вымушанай неабходнасцю, паколькі выкладчык не валодае французскай і нямецкай мовамі, а зносіны паміж выкладчыкам і вучнямі адбываюцца выключна на беларускай мове без выкарыстання мовы-пасрэдніка.

Аналізуючы выкарыстанне імерсіўнага метаду навучання замежным мовам, даследчыкі адзначаюць высокую эфектыўнасць перадачы ведаў ва ўмовах заглыблення ў моўнае асяроддзе, у межах якога мэтавая мова выступае асноўным сродкам камунікацыі, навучання і ўзаемадзеяння [Cekaite, Aronsson 2005; Pace і інш. 2025].

Зразумець значэнні новых слоў, запомніць іх і пачаць выкарыстоўваць у маўленні дапамагаюць:

- візуальныя матэрыялы (малюнкі, відэа, цацкі, рэчы, якія дэманструюць лексіку пэўных семантычных груп, і г. д.),
- рухі, жэсты (дапамагаюць патлумачыць значэнні дзеясловаў),
- інтанацыя і міміка (дазваляюць растлумачыць семантыку прыметнікаў),
- стварэнне камунікатыўных сітуацый (У краме, Святкуем Купалле, Выбіраемся ў вандроўку і інш.),
- сторытэлінг (*storytelling*): дзеці слухаюць і абмяркоўваюць нескладаныя гісторыі, а таксама ўдзельнічаюць у іх стварэнні. Вучні лепш успрымаюць і запамінаюць моўны матэрыял у кантэксце сюжэту, вобразаў і эмоцый,
- моўныя гульні (Знайдзі пару, Што знікла?,

Знайдзі лішняе слова, Здагадайся па апісанні, Інтэрв'ю, Рабі як я, Прыдумай сказ па малюнках і інш.).

На занятках у *Ліхтарыку* выкарыстанне метаду заглыблення пачынаецца з самых простых заданняў, ужо знаёмых вучням, якія на пачатку патрабуюць толькі элементарных ведаў і паступова ўскладняюцца. Мэтазгоднасць такога падыходу пацвярджаецца даследаваннямі ў галіне выкладання замежных моў у розных краінах: "An important strategy is to use Target Language first for tasks which are already very familiar to students (so that they have the relevant schemata to help comprehension) or which require only simple Target Language" [Littlewood, Yu 2011: 75].

Пачынаць выкладанне па асноўных напрамках (чытанне, пісьмовая мова, вусная мова, аўдыяванне) вучням, для якіх беларуская мова з'яўляецца цалкам незнаёмай, даводзіцца ва ўмовах адсутнасці практычных дапаможнікаў, зборнікаў тэкстаў і падручнікаў, створаных менавіта па методыцы **беларуская мова як замежная для дзяцей**.

Выданне падручнікаў па беларускай мове як замежнай вядзецца з другой паловы XX ст. Аднак большасць дапаможнікаў не прыдатная для выкладання беларускай мовы як замежнай дзецям па наступных прычынах:

1. Мэтавай аўдыторыяй такіх дапаможнікаў з'яўляюцца дарослыя людзі [Кривицкий, Михневич, Подлужный 1990; Аляксандраў, Мыцык 2008; Павловская і інш. 2012; Блешчык 2015; Мыцык 2015] або студэнты-філолагі [Рамза 2010; Валочка, Фу Мэйянь, Юань Хаа 2020; Сямешка 2021; Kaleta 2021].

2. Пасрэднікамі для вывучэння беларускай мовы ў такіх падручніках выступаюць польская, руская, англійская мовы. Але дзеці, якія нарадзіліся і выхоўваюцца ў ЗША, Канадзе ці еўрапейскіх краінах, не заўсёды валодаюць гэтымі мовамі.

3. Моўныя патрэбы і ўзроставая псіхалогія дзяцей значна адрозніваюцца ад матывацыі дарослых ды студэнтаў. Падручнікі, прызначаныя для дарослых, арыентуюцца на абстрактнае мысленне, здольнасць да свядомага аналізу граматычных структур, уменне засвойваць матэрыял праз тэарэтычныя апісанні і граматычныя табліцы, у той час як дзеці, асабліва пачатковага школьнага ўзросту, засвойваюць мову праз гульню, рух, канкрэтныя сітуацыі і вобразнае мысленне, таму дарослыя дыдактычныя мадэлі для іх непрадуктыўныя.

4. Звычайна дапаможнікі для студэнтаў і дарослых змяшчаюць сістэмныя апісанні граматыкі (скланенні, віды дзеясловаў, катэгорыі часу), абстрактную лексіку, тэксты, не прыстасаваныя для дзіцячай кампетэнцыі. Для вывучэння беларускай мовы як замежнай дзецьмі патрэбна мінімальная, камунікатыўная, сітуацыйная граматыка, а таксама вялікая колькасць практыкаванняў, створаных у форме гульні.

5. Падручнікі па беларускай мове як замежнай для дарослых не прадугледжваюць гульнявых практыкаванняў з яркімі, цікавымі, сучаснымі малюнкамі, змяшчаюць недастатковую колькасць візуальных матэрыялаў, не прадугледжваюць дадаткаў з відэа- і аўдыяматэрыяламі для дзяцей, не змяшчаюць заданняў на падтрымку эмацыйнай матывацыі. Але дзеці, як вядома, не могуць эфектыўна займацца толькі па тэкставых і аналітычных матэрыялах.

6. Мэтай падручнікаў для дарослых з'яўляецца фармальная, навуковая або прафесійная камунікацыя. Таму навучальныя тэксты апісваюць сітуацыі, звязаныя са студэнцкім жыццём, выбарам прафесіі, замежнымі камандзіроўкамі, сродкамі масавай інфармацыі і г. д. Аднак праца з дзецьмі вымагае зусім іншага кантэнту: назвы колераў, сям'я, школа, цацкі, гульні, падарожжы, жывёлы, расліны, адзенне, часткі цела чалавека і г. д. Акрамя таго, для ўжо існуючых падручнікаў характэрны занадта складаныя камунікатыўныя мадэлі, працяглыя дыялогі, адсутнасць візуальных апор для кожнай лексічнай падтэмы.

7. Падручнікі для дарослых і для студэнтаў-філолагаў разлічаны на вялікую колькасць акадэмічных гадзін. У той час як дзеці эмігрантаў часцей за ўсё займаюцца вывучэннем беларускай мовы адзін раз у тыдзень на працягу

1–2 акадэмічных гадзін. У гуртку *Ліхтарык* і ў іншых падобных гуртках заняткі адбываюцца адзін раз на тыдзень, без магчымасці штодзённай беларускамоўнай практыкі, таму матэрыялы павінны быць кампактнымі і ёмістымі.

8. Культурны кантэкст, прадстаўлены ў падручніках для дарослых, не заўсёды адпавядае патрабаванням выхавання і навучання дзяцей, якія жывуць па-за межамі Беларусі. Падручнікі для дарослых змяшчаюць тэксты пра гісторыю, палітыку, грамадства, складаныя культурныя апісанні. Дзецям больш падыходзіць такое тэкставае напаўненне, як казкі, простыя вершы, гульні, аповеды пра Беларусь у дзіцячым фармаце, матэрыялы, якія дапамагаюць фарміраваць беларускую ідэнтычнасць.

Трэба адзначыць, што і ў XX стагоддзі, і ў апошнія дзесяцігоддзі па-за межамі Беларусі таксама выдаюцца сучасныя падручнікі і дапаможнікі па беларускай мове для дзяцей малодшага ўзросту, якія, аднак, разлічаны на вывучэнне беларускай мовы як роднай або як спадчыннай [Пашкевіч 1968; Ваўранюк 2013; Ваўранюк 2021]. Такія падручнікі і дапаможныя матэрыялы былі створаны для дзяцей, якія ўжо валодаюць беларускімі (ці хаця б славянскімі) фанетычнымі і граматычнымі навыкамі, умеюць чытаць і пісаць па-беларуску або па-руску.

Лексіка і граматыка ў падручніках па беларускай мове, распрацаваных за мяжой, падаецца ў аб'ёмах, якія адпавядаюць патрабаванням носьбітаў мовы: вялікі слоўнікавы запас, хуткае ўвядзенне марфалагічных катэгорый, заданні на правапіс. Для дзяцей, якія вывучаюць мову з нуля адзін раз на тыдзень, такі тэмп здаецца вельмі хуткім.

Такім чынам, паколькі ў апошнія гады за межамі Беларусі сфармаваліся новыя супольнасці беларусаў, у якіх узнікла патрэба ў сістэмным навучанні дзяцей беларускай мове, відавочнай з'яўляецца неабходнасць стварэння лінейкі практычных дапаможнікаў, якія б маглі выкарыстоўвацца настаўнікамі беларускай мовы як замежнай для дзяцей школьнага ўзросту.

На наш погляд, такія матэрыялы павінны ўлічваць:


1) адсутнасць у дзяцей натуральнага моўнага асяроддзя і неабходнасць кампенсаваць недахоп штодзённага кантакту дзяцей з беларускай мовай;
2) адсутнасць у вучняў знаёмства з фаналагічнай базай беларускай мовы і навыкаў чытання на кірыліцы;
3) прыярытэт камунікатыўнага падыходу над авалоданнем арфаграфіяй, граматыкай і над сістэмнай тэарэтычнай падрыхтоўкай;
4) неабходнасць развіцця маўлення, разумення на слых, элементарнага чытання і авалодання базавай лексікай;
5) патрэбу ў вялікай колькасці гульнявых і камунікатыўных практыкаванняў, кароткіх тэматычных модуляў, мультымедыйных матэрыялаў;
6) патрэбу ў фарміраванні пазітыўнай матывацыі: цікавыя, кароткія, эмацыйна прывабныя тэксты, якія спрыяюць стварэнню станоўчага вобраза мовы і культуры;
7) неабходнасць у цікавых, ёмістых, яркіх па форме заданняў, якія б дапамаглі дзецям перавесці пасіўны лексічны запас у актыўны і падтрымлівалі пазітыўную матывацыю для авалодання мовай.

У межах дзейнасці беларускамоўнага гуртка *Ліхтарык* у ЗША распрацоўваецца базавы курс для дзяцей, якія пачынаюць вывучаць беларускую мову з нуля. Курс уключае:

1. *Першую чытанку*, на падставе якой ажыццяўляецца знаёмства з беларускімі літарамі і фарміруюцца навыкі чытання першых складоў, слоў, сказаў і невялікіх тэкстаў.

Паколькі вучні не валодаюць беларускімі граматычнымі формамі і складанымі сінтаксічнымі канструкцыямі, у *Першай чытанцы* ў якасці матэрыялу для чытання змяшчаюцца ў асноўным назоўнікі. Зрэдку выкарыстоўваюцца выклічнікі і гукапераймальныя словы (*Му! Ух!*), а таксама прыслоўі (*суха*, *там*, *тут*). Пазней уводзяцца першыя прыметнікі (назвы колераў, памераў, эмоцый і г. д.). Паступова ўводзяцца сказы з дзеясловамі (*Мама спіць*) і першыя граматычныя канструкцыі з назоўнікамі ў формах ускосных склонаў (*У слана салата*).

Выкладанне беларускай мовы як замежнай дзецям…



Малюнак 1. Старонкі з *Першай чытанкі* для дзяцей, якія вывучаюць беларускую мову як замежную

2. Лексічныя модулі, якія дапамагаюць вучням назапасіць лексіку па розных тэмах (Жывёлы, Расліны, Колеры, Назвы месяцаў і сезонаў, Часткі цела чалавека, Святы, Сям'я і інш.). Засваенне кожнай лексічнай тэмы прадугледжвае знаёмства з новай лексікай (вучні слухаюць, як вымаўляюцца словы, супастаўляюць іх з выявамі, чытаюць самастойна); практычнае засваенне новай лексікі падчас выканання заданняў (напрыклад: знайдзі назвы насякомых; злучы словы з малюнкамі; напішы назвы істот на малюнках; прачытай сказы, устаўляючы замест малюнкаў адпаведныя словы; спалучы назвы месяцаў з порамі года і г. д.); ужыванне новых слоў у маўленні (выкарыстоўваюцца адказы на пытанні, інтэрактыўныя гульні, мадэляванне простых моўных сітуацый); кантроль засваення (пасля кожнай лексічнай тэмы вучні маюць магчымасць прайсці інтэрактыўны тэст).



Малюнак 2. Прыклады заданняў з лексічных модуляў *Расліны*, *Часткі цела* і *Жывёлы*

3. Граматычныя модулі (на дадзены момант распрацаваны тэмы: Род і лік назоўнікаў, Асабовыя займеннікі ў форме Назоўнага склону, Прыналежныя займеннікі ў форме Назоўнага склону, Інфінітыў, Дзеясловы ў форме трэцяй асобы, Канчаткі прыметнікаў у Назоўным склоне, Канчаткі назоўнікаў у Назоўным, Вінавальным і Месным склонах і інш.).



Малюнак 3. Прыклады граматычных заданняў па тэмах *Асабовыя займеннікі, Дзеясловы, Канчаткі прыметнікаў*

4. Малюнкавы слоўнік па асноўных лексічных тэмах, карткі, якія можна выкарыстоўваць у якасці размалёвак, для гульняў *Бінга*, *Лато* і г. д.



Малюнак 4. Гульнявыя карткі для развіцця лексічных і камунікатыўных навыкаў

5. Відэа- і аўдыяматэрыялы: аўтар стварае відэакантэнт, пэўная частка якога з поспехам выкарыстоўваецца падчас засваення новай лексікі вучнямі-іншафонамі. Анлайн-курс даступны на YouTube-канале *Беларуская мова з Ліхтарыкам*: www.youtube.com/@Lihtaryk777. На канале змешчаны інтэрактыўныя відэаролікі, якія дазваляюць дзецям узаемадзейнічаць з героямі анімацыі: адказваць на пытанні, разгадваць загадкі, выконваць заданні падчас прагляду. Такі інтэрактыўны фармат робіць вывучэнне беларускай мовы больш дынамічным і персаналізаваным, падтрымлівае ўвагу і пазітыўную матывацыю вучняў.

На першапачатковым узроўні вучні могуць проста глядзець відэаролікі, слухаць і паўтараць вымаўленне новых слоў (напрыклад, серыя *Як сказаць па-беларуску*), а па меры авалодвання лексікай і граматыкай можна пераходзіць да прымянення тэарэтычных ведаў на практыцы. Прыклады заданняў: паглядзі на малюнкі і знайдзі лішняе слова ў кожным радку; прачытай сказ, выкарыстоўваючы словы замест малюнкаў; запішы назвы месяцаў у адпаведным парадку; дапоўні сказы; знайдзі сярод малюнкаў адпаведныя з'явы прыроды; назаві дзеянні, якія табе падабаюцца, і г. д.).

Відэаматэрыялы, змешчаныя на канале, могуць эфектыўна выкарыстоўвацца ў мэтах назапашвання новай лексікі і развіцця маўлення: вучні могуць паўтараць за выкладчыкам тэматычныя словы, слухаць і самастойна чытаць невялікія тэксты па розных тэмах (надвор'е, забудовы, часткі цела, назвы посуду, назвы месяцаў, дні тыдня і інш.), ствараць уласныя выказванні паводле ўзору; гуляць у ролевыя гульні.

6. Інтэрактыўныя гульні на анлайн-платформах:
- *Карагод года* на платформе WordWall: https://wordwall.net/teacher/20524566/folder/4721123/карагод-года-1
- *Інтэрактыўныя практыкаванні па беларускай мове* на платформе LearningApps: https://learningapps.org/user/anastasia dzesh
- *Інтэрактыўны практыкум па беларускай мове для дзяцей* Liveworksheets: https://www.liveworksheets.com/u/anadzesh

Створаныя аўтарам анлайн-гульні абапіраюцца на малюнкі, сімвалы і анімацыю; змяшчаюць выразныя візуальныя элементы і мінімум тэксту на старце; спрыяюць развіццю такіх навыкаў, як чытанне, маўленне і пісьмо. Заданні распрацаваныя такім чынам, каб не перагрузіць вучняў і дапамагчы засваенню моўнага матэрыялу натуральна і паступова. Гульні маюць важнае значэнне для вывучэння замежных моў у раннім узросце: яны стымулююць уяўленне, павышаюць матывацыю, спрыяюць актыўнаму ўключэнню дзяцей у камунікатыўную дзейнасць, палягчаюць засваенне новай лексікі і граматычных структур, развіваюць маўленчыя навыкі і фарміруюць станоўчае эмацыйнае стаўленне да вывучэння мовы [Waddington 2023].

Праведзены аналіз дазваляе сцвярджаць, што ўмовы функцыянавання беларускай мовы ў асяроддзі сучаснай дыяспары патрабуюць істотнага пераасэнсавання традыцыйных дыдактычных падыходаў і распрацоўкі новай методыкі навучання дзяцей, асабліва тых, якія вывучаюць беларускую мову як замежную. Аналіз трох моўных груп, прадстаўленых у дзейнасці гуртка *Ліхтарык* у ЗША, паказвае, што ступень валодання беларускай мовай істотна адрозніваецца ў залежнасці ад сямейнага моўнага асяроддзя, ад аб'ёму і якасці натуральнай моўнай практыкі. У выніку выяўлена, што існуючыя падручнікі па беларускай мове, створаныя для навучання дарослых або для школьнікаў у Беларусі, не адпавядаюць адукацыйным патрэбам дзяцей-іншафонаў у ЗША і іншых краінах з дамінантным небеларускім моўным асяроддзем. Асаблівая ўвага павінна надавацца камунікатыўнай, гульнявой і мультымедыйнай арганізацыі навучальнага працэсу, якая кампенсуе адсутнасць натуральнага моўнага кантакту і стымулюе ўнутраную матывацыю вучняў. Практыка выкладання беларускай мовы ў ЗША пацвярджае, што найбольш эфектыўным з'яўляецца модульны падыход, які спалучае лексічныя, граматычныя і фанетычныя блокі з вялікай колькасцю інтэрактыўных і візуальна прывабных матэрыялаў, якія забяспечваюць паступовае

фарміраванне базавых маўленчых навыкаў у дзяцей-іншафонаў. У той жа час у групах дзяцей, для якіх беларуская мова з'яўляецца роднай або спадчыннай, найбольшую эфектыўнасць паказваюць праграмы, накіраваныя на пашырэнне слоўнікавага запасу і паглыбленне камунікатыўных уменняў. У сукупнасці атрыманыя вынікі сведчаць пра неабходнасць стварэння спецыялізаванай лінейкі навучальных матэрыялаў, арыентаваных на ўзроставыя і моўныя патрэбы вучняў, якія вывучаюць беларускую мову як замежную. Такія матэрыялы павінны ўлічваць шматмоўнасць навучэнцаў, абмежаванасць кантакту з беларускай мовай і патрэбу ў высокай ступені інтэрактыўнасці. Такім чынам, даследаванне пацвярджае важнасць фарміравання сучаснай педагагічнай мадэлі, якая б садзейнічала эфектыўнаму і ўсебаковаму засваенню беларускай мовы дзецьмі, што жывуць па-за межамі Беларусі, і спрыяла б захаванню моўнай і культурнай ідэнтычнасці беларускай дыяспары.

References

Аляксандраў Сяргей, Мыцык Галіна. 2008. *Гавары са мной па-беларуску. Гутарковая мова ў штодзённым ужытку.* Масква [Aljaksandraŭ Sjarhej, Mycyk Halina. 2008. *Havary sa mnoj pa-belarusku. Hutarkovaja mova ŭ štodzённym užytku.* Maskva].

Беларуская мова з Ліхтарыкам [*Belaruskaja mova z Lixtarykam*] [online] www.youtube.com/@Lihtaryk777 [22.11.2025]

Блешчык Алена. 2015. *Беларуская мова для рускамоўных: практыкум.* Екацярынбург [Bleščyk Alena. 2015. *Belaruskaja mova dlja ruskamoŭnyx: praktykum.* Ekacjarynburh].

Валочка Ганна, Фу Мэйянь, Юань Хаа. 2020. *Беларуская мова як замежная. Уводны курс для кітайскіх навучэнцаў.* Мінск [Valočka Hanna, Fu Mèjjan', Juan' Xaa. 2020. *Belaruskaja mova jak zamežnaja. Uvodny kurs dlja kitajskix navučènsaj.* Minsk].

Ваўранюк Аліна. 2013. *Лемантар: падручнік па беларускай мове для 2 класа.* Беласток [Vaŭranjuk Alina. 2013. *Lemantar: padručnik pa belaruskaj move dlja 2 klasa.* Belastok].

Ваўранюк Аліна. 2021. *Колазварот: падручнік па беларускай мове для 4 класа пачатковай школы.* Беласток [Vaŭranjuk Alina. 2021. *Kolazvarot: padručnik pa belaruskaj move dlja 4 klasa pačatkovaj školy.* Belastok].

Інтэрактыўныя практыкаванні па беларускай мове [*Intèraktyŭnyja praktykavanni pa belaruskaj move*] [online] https://learningapps.org/user/anastasia dzesh [22.11.2025]

Інтэрактыўны практыкум па беларускай мове для дзяцей [*Intèraktyŭny praktykum pa belaruskaj move dlja dzjacej*] [online] https://www.liveworksheets.com/u/anadzesh [22.11.2025]

Карагод года [*Karahod hoda*] [online] https://wordwall.net/teacher/20524566/folder/4721123/карагод-года-1 [22.11.2025]

Кривицкий Александр, Михневич Арнольд, Подлужный Александр. 1990. *Белорусский язык для говорящих по-русски.* Минск [Krivickij Aleksandr, Mixnevič Arnol'd, Podlužnyj Aleksandr. 1990. *Belorusskij jazyk dlja govorjaščix po-russki.* Minsk].

Мыцык Галина. 2015. *По-белорусски? Пожалуйста! = Па-беларуску? Калі ласка!.* Минск [Mycyk Galina. 2015. *Po-belorusski? Požalujsta! = Pa-belarusku? Kali laska!.* Minsk].

Павловская Наталья, Борисенко Ольга, Васюченко Пётр, Кныш Лариса, Семенькевич Оксана, Чеховский Георгий. 2012. *Белорусский язык для стран СНГ: учебник.* Москва [Pavlovskaja Natal'ja, Borisenko Ol'ga, Vasjučenko Pëtr, Knyš Larisa, Semen'kevič Oksana, Čexovskij Georgij. 2012. *Belorusskij jazyk dlja stran SNG: učebnik.* Moskva].

Пашкевіч Валянціна. 1968. *Першая чытанка пасля лемантара для беларускіх дапаўняльных школаў.* Кліўленд [Paškevič Valjancina. 1968. *Peršaja čytanka paslja lemantara dlja belaruskix dapaŭnjal'nyx školaŭ.* Kliŭlend].

Рамза Таццяна. 2010. *Беларуская мова? З задавальненнем! Для замежных навучэнцаў.* Мінск [Ramza Taccjana. 2010. *Belaruskaja mova? Z zadaval'nennem! Dlja zamežnyx navučènsaŭ.* Minsk].

Сямешка Лідзія. 2021. *Беларуская мова для кітайскіх студэнтаў. Пачатковы ўзровень.* Мінск [Sjameška

Lidzija. 2021. *Belaruskaja mova dlja kitajskix studèntaŭ. Pačatkovy ŭzroven'*. Minsk].

Cekaite Asta, Aronsson Karin. 2005. *Language Play, a Collaborative Resource in Children's L2 learning.* "Applied Linguistics" 26(2): 169–191.

Kaleta Radosław. 2021. *Popularna gramatyka białoruska dla obcokrajowców*. Warszawa: Radosław Kaleta.

Littlewood William, Yu Baohua. 2011. *First language and target language in the foreign language classroom.* "Language Teaching" 44(1): 64–77.

Pace Amy, Lü Chan, Guo Laura, Zhou Jieyu. 2025. *Narrative Skills in Mandarin–English Dual Language Immersion Learners.* "Applied Linguistics" 46(3): 435–454.

Swain Merrill, Lapkin Sharon. 2013. *A Vygotskian Sociocultural Perspective on Immersion Education: The L1/L2 Debate.* "Journal of Immersion and Content-Based Language Education" 1: 101–129.

Waddington Julie. 2023. *Early foreign language education: play as a site for child agency.* "Journal of Multilingual and Multicultural Development" 47(8): 4748–4762.